**Матырка, В.** Куля ў шлеме / В. Матырка // Лепельскі край. — 2009. — 24 лют. — С. 2.

## КУЛЯ Ў ШЛЕМЕ



Аляксандр нарадзіўся ў сям'і Леаніда і Ганны Хрышчанкаў у вёсцы Звязда. Адразу пасля заканчэння Пышнянскай дзесяцігодкі яго ў 1986 годзе прызвалі ў ар-мію і накіравалі ў вучэбную часць на Кушку. З таго, што іх рыхтуюць для вайны ў Афганістане, ніхто не рабіў ніякага сакрэту.

Аляксандр змалку меў цікавасць да тэхнікі, не раз разам з бацькам выязджаў у поле на трактары, юнака адразу залічылі на курсы механікаў-рамонтнікаў БТР-70. Браня ў яго была лёгкая, прабівалася нават з некаторых відаў стралковай зброі. Але плюсамі былі: аўтаматычная гармата з высокім вуглом узвышэння: дзякуючы гэтаму яна выдатна біла па гарах; а таксама хуткасць, манеўранасць і прахадзімасць. Хуткасць машыне давалі два фарсіраваныя рухавікі ГАЗ-53.

Праз шэсць месяцаў савецкіх салдат самалётам перакінулі ў Кабул. Служыць давялося ў батальёне аховы на ўскраіне горада. У складзе часці былі і мотастралкі, і танкісты, і сапёры, і хімікі. Прыкрывалі подступы да палаца Аміна, у ім размяшчаўся штаб 40-й арміі.

Узвод, у якім служыў Аляксандр, жыў на сваіх баявых пазіцыях. Спалі ў зямлянках, а тэхніка стаяла ў капанірах. Навокал былі мінныя палі, таму душманы баяліся адкрыта нападаць.

Акрамя службы непасрэдна на пазіцыях, вадзіцелям час ад часу даводзілася суправаджаць калоны. Тры разы Аляксандр ездзіў на Хайратон, адзін раз мінаў сумна знакаміты перавал Саланг. Усяго за 20 месяцаў службы ў Афгане на сваім БТРы ён наматаў 21 тысячу кіламетраў. Не раз трапляў у засады, але ў сярэдзіне 80-ых гадоў нашы салдаты навучыліся дзейнічаць у такіх сітуацыях і пазбягаць вялікіх страт. Аднойчы, напрыклад, давялося суправаджаць грузавікі з нашымі вольнанаёмнымі будаўнікамі праз Кабул.

– Спераду рухаўся БТР, потым два грузавікі, і я замыкаў калону. Раптам амаль у цэнтры горада да нас хутка падлятае джып, рэзка спыняецца, з яго раздаецца стрэл, і машына рэзка зрываецца з месца. Вадзіцелі грузавікоў прыбавілі ходу. Хлопцы, што былі ў мяне на брані, некалькі разоў пальнулі джыпу ўслед, але патрапіць не змаглі. Мы агледзеліся, забітых і параненых не было. Вярнуўшыся на сваю пазіцыю, я агледзеў, што ў мяне ў шлеме – куля! Гэта быў танкісцкі шлем з рабрынамі бяспекі, у адной з такіх рабрын куля і засела. Я ўзрадаваўся: во, забяру шлем дадому, будзе як рэліквія! Але дзе там! Узводны лейтэнант Аляксандр Даўгавідаў забраў у мяне яго і спаліў са словамі: «Няма чаго табе маці і бацьку палохаць. Ім і без гэтага там не салодка.» – І ў той жа дзень выдаў новы шлем. Разумны быў наш узводны, як у ваду глядзеў. Ужо пасля вяртання я даведаўся, што мае бацькі за час маёй службы ссівелі, маці не прапускала ніводнай перадачы «Служу Советскому Союзу» па тэлевізары. Там тады рэпартажы з Афганістана вёў наш зямляк Аляксандр Шкіранда. Нават прасіла даярак падмяніць яе, калі не паспявала з дойкай.

***– Які быў самы страшны выпадак?***

Было гэта на пачатку службы ў Афгане. На міне падарваўся наш салдат. Ляжыць ён пасярод міннага поля, крычыць, крывёю сцякае, а падысці не можам, чакаем сапёраў.Вырашаю ехаць да яго на сваім БТРы. А што, думаю, міны там толькі супрацьпяхотныя. Машыне вялікай шкоды яны не прычыняць. І вось еду, на бране яшчэ двое ці трое нашых хлопцаў і чую выбух. Дзве міны зачапіў! Але нічога, у БТРы ж восем колаў. Пад´ехаў да параненага, хопцы, не злазячы на зямлю, усцягнулі яго на браню, паклалі спераду, а я даў задні ход. А перад маімі вачыма нага гэтага салдаціка, дакладней абрубак, з якога кроў льецца. Мяне такі калатун узяў – аж БТР няроўна паехаў. Узводны крычыць: «Хрышчанка, вядзі раўней!» Потым да такіх карцін прывык, але на той час было жудасна.

На пазіцыях салдаты стараліся жыць як дома, аўчарку падарылі сапёры. Жывёліна была кантужаная, але навыку не згубіла, міны чула ідэальна. Была і каза, якая бегала за салдатамі, як сабака. У салдатаў быў фотаапарат. Ён не належаў камусьці аднаму, а ўсяму ўзводу. Фотаплёнку і хімікаты салдаты куплялі ў гарнізоннай краме або ў мясцовых гандляроў дуканшчыкоў, З адным з іх, Заірам Аляксандр наладзіў прыяцельскія адносіны. Заір у свой час вучыўся ў Кіеве, добра ведаў рускую мову, таму моўнага бар´ера не існавала.

Ледзь дачакаўся Аляксандр дэмбеля. У Афганістане знаходзіўся з семага мая 1987 года па адзінаццатага студзеня 89-га. У хуткім часе пасля вяртання ажаніўся з зямлячкай Ірынай, нарадзілі дваіх дзяцей. Сын Леанід зараз служыць у зенітнай ракетнай брыгадзе ў Межыцы, бацька ім ганарыцца. А дачка Каця – дзевяціклассніца.

**В. Матырка**

**На здымку: Ірына і Аляксандр Хрышчанка**

**Фота аўтара**